# ДУБРОЎСКІ НАСТРОЙ

№ 108

КРАСАВІК 2008

НАРОДНЫ БАЯВЫ ЛІСТОК ДУБРОВА ПАРЫЦКІ ПАВЕТ

## ДЗЯРЖАЎНЫ ЗГОН

**С**падчына Сталіна...

Найвышшы парадак Гітлера... Усё гэта прапагандыскае пойла для прасьцячкоў. Насамрэч беларускія ўлады занятыя не пошукамі тэарытычнага падмурку сваёй дзяржавы, а нашмат больш празаічнымі справамі: як латвей трымаць народ у аброці падпарадкавання і як болей зь яго выдаіць грошай.

Адным з прыёмаў, асьвечаных шчэ камуністамі, сталіся уваскрэшаныя «суботнікі», трыумф «вольнай» працы па прымусу.

Адбыўся такі прымусовы «суботнік» і ў Дуброве. У мінулым іх прымяркоўвалі да дня народзін бальшавіка Леніна, цяперака ён чамусьці чашчэй супадае з днём народзін Гітлера, 20 красавіка От 19 красавіка народ, ад старога да малога, пагналі на прыборку тэрыторыяў. Папярэдне з кожнага працоўнага ўзялі грошы, так што за суботнік, як заўсёды, трэба было заплаціць.

У некаторых канторах заплаціўшы, можна было і не хадзіць зьдзіраць пракаветняе лісьце ці сабацкія каўляшы.

У іншых было строга. Адзін знаёмец з нафтавікоў баіў, што іх змусілі расьпісацца ў дзьвух паперах пад абавязаннем прыйсьці на суботнік. Работнікаў папярэдзілі, што іхні ўдзел у ўсенародным платным сьвяце будзе ўлічаны пад час падпісання новых працоўных кантрактаў. Вядома, ніхто сабе не вораг, сьцяўшы зубы, работнікі паўдня неяк прасачкавалі.

Навошта змушалі падпісваць ажно дзьве паперы? Каб лепей застрашыць працоўных.

Насамрэч, у кожным грамадзтве існуе патрэба і традыцыя бескарысьлівай дабраахвотнай працы. Але багата дзе такая праца арганізуецца самім грамадзтвам. І толькі ў нас, у Беларусі, такая праца стала формаю часовага рабства, сродкам выбівання грошай на нейкія нябачныя нам мэты, прычым, хоць гэта нашыя грошы, але ніхто і ніколі не ведае колькі іх і ці сапраўды яны выдаткоўваюцца мэтазгодна, ці не раскрадаюцца іх і праверыць нічога немагчыма.

Цынічна выглядае і сама працэдура выдаткавання сродкаў. Беларускі дыктатар будуе ледзяны палац; на суботніку ён, працуючы ў палацы, заробіць грошы, якія аддасьць на медыцыну. То бок на народную медыцыну ідуць рожкі ды ножкі ад палацавага каштарысу. Ці, як кажуць, вазьмі, нябожа, што мне нягожа.

А што ж перашкаджае народалюбнаму дыктатару адразу даць патрэбныя грошы на медыцыну? Раней памешчыкі зганялі сялян на тэрміновую працу. Цяперака ў нас дзяржаўны згон. Прыехалі!

## МІЛАСЬЛІВЕЦ.

Беларускі дыктатар каторы ўжэ раз паказуе адзін і той жа абрыдлы спектакль, бы грэцкі Пратэй ператвараючыся то ў ліхога, то ў добрага паліцыянта. Спярша ён, як пуга, робіць народу паскудства, а пасьля, як прыпадачны, крычыць, на чыноўнікаў, чаму пакрыўдзілі любімы ім народ, і крывадушна вяртае кавалачак адабранага пернiку.

Вось і зараз пастаўлена такая пастаноўка. Лоўка выбіўшы пад Новы год- нават датэрмінова, з 15 сьнежня!- з-пад ног пеньсіянераў і моладзі належныя ім пракаветнія ільготы на праезд, ён 21 красавіка вяртае, цяперака ўжэ часова!, частку адабранага ў пеньсіянераў. Пеньсіянеры змогуць ільготна езьдзіць на сваю сельгаспрацу, вырошчваць ураджай і карміцца , каб не галадаваць узімку.

А студэнтам і вучням? Чаму ім не вернутыя з дыктатаравага пляча праязныя ільготы? Бацькі студэнтаў абураныя, але іхнае абурэнне зьнешне не выказваецца. А дарма!

Дыктатар мусіць ведаць праўду. Таму выказвайце сваю незадаволенасьць свайму начальству, у манапольцы, участковаму. Даношчыкі ёсьць усюды і яны мусяць даносіць ісьцінныя настроі наверх.

Не шкадуйце энергічных слоў! Не можаце пратэставаць прама, рабіце гэта ўскосна. Паможа!

## ФАНЕРАГАМІЯ Ў ДУБРОВЕ.

Калі хто не ведае, што такое фанерагамія, то патлумачым гэтае рэдкае грэцкае слова. «Фанерагамія- публічна ўчынены полавы акт».

Было тое 15 чысла. Як звычайна, дуброўскія школьнікі-маляўкі пайшлі з настаўнікам на фізкультуру на школьны стадыён. Ну, скакалі тамака, бегалі. І якое ж было іхняе зьдзіўленне, калі за копкаю леташняга сена яны ўбачылі любоўныя практыкаванні салодкай парачкі. Хто займаўся сярод белага дня на вачах у дзяцей ахвярапрынашэннямі Венеры невядома: да палюбоўнікаў-фанерагамшчыкаў ніхто не падыходзіў, але можна меркаваць, што гэта нехта з тутэйшых аматараў марачнага пойла. Нажлукціўшыся дзяржаўнага сцыклівага алкаголію мужыкі і бабы паператвараліся ў Прыяпаў і аддаваліся рамантычнаму каханню пад стогам парудзелай леташняй травы незважаючы на людзей і дзяцей.

Дзеці па тэлевізару ўсякае бачылі, таму проста пахіхікалі.

Але ў натуры такое нячаста бывае ў нас, «у наваколлі Лондану», як казаў Эжэн Іянеску. Дзяржаўнае пойла, хай сабе і марачнае, сьвежае, робіць з чалавека будліну.

Масавае пойла даводзіць да масавага збыдлення.

Ак толькі памяняем цара і царонка, усе пойлавыя заводы перавядзём на выпуск паліва для мапедаў і мацатыклаў.

А школьнай дырэктарцы трэба ці то паставіць забараняльныя таблічкі на стадыёне, ці то прачэсваць стадыён перад урокамі і праганяць дубцом ахвочых да злучкі Адамаў і Еў у іншае месца.

## КАРОВЫ СВАЁ СЛОВА ТРЫМАЮЦЬ. МАЛАКАЗАВОД-НЕ.

Дзякаваць Богу, дуброўскія каровы спраўна дояцца і малако ў даёнках не высыхае.

Толькі вось карысьці ад гэтага небагата. Штатны мядкоўскі малаказавод, які гідзіцца беларускай мовы, завінаваціўся дуброўцам ажно 80 мільёнаў зайцоў і ніяк не аддае.

У нармальнай дзяржаве гаспадарчыя спрэчкі вырашае суд. Але ў нас хіба дзяржава сама з сабою будзе судзіцца?

Дык дуброўская гаспадарка спрабуе выкруціцца, прадаючы малако ажно ў Магілёў: там-тэйшыя дзялкі самі вывозяць сырадой і плацяць болей грошай. Тутэйшы шацілкаўскі старчаковы касік хацеў быў грозна наехаць на дуброўскага дырэктара арцелі сп. Зьмітра за такое эканамічнае свавольства і сабатаж, але сілаю розуму і неабвержных фактаў хамскія валюнтарысцкія наскокі былі адпрэчаныя.

(Дарэчы, кажуць, шацілкаўскі старчаковы спраўна валодае расейскім матам і не стыдаецца прамаўляць яго да культурных людзей нават у будынку райсавету ў Шацілках). Страмнік, што тут сказаць.

**Дарэчы, пра суд і норавы.**
(Гістарычны хвакт)

Прускі кароль Фрыдрых II збудаваў сабе замак Сан-Сусі у Потсдаме пад Берлінам. Але каралю надта перашкаджаў млын, што працаваў непадалёку. Млынара ўгаворвалі прадаць млын ці зачыніць, а той упёрся -і нікуды. Тады зажураны кароль сказаў: «Я забяру млын». «Не забярэш», запярэчыў міністр, «бо ў Берліне ёсьць суд і ён вырашыць не на тваю карысьць»

Такія тады ў іх былі норавы.

## БОЙКА ГРУЗЧЫКАЎ.

З далёкай старонкі, аднекуль з ажно з Расеі, прыехалі ў Дуброву машыны скупляць картоплі. Хто аддаў за 400 рублёў за кіло, хто прадаў за 500. Словам, тутэйшы прадукт меў збыт.

А нанятыя грузчыкі пацешылі дуброўскіх дзетак тым, што нажлукціўшыся таннага субпрадукту нашай пойлавай прамысловасьці моцна пап”янелі і ўчынілі між сабою бойку.

Бойка, вядома, кончылася нічым, бо была ўсчатая з-за нічога. Проста, алкаголь мазгі затлуніў.

Стражніка пры бойцы такама не было.

---

## КОНТРЭФАРМАЦЫЯ

Хто не прапазяхаў беларускага тэлебачання 17 числа не мог не заўважыць змрочнага, як дзірка ў прыбіральні, беларускага дыктатара. Бачачы яго, ўссядаючы на чале нейкай нарады, нельга было пазбыцца адчування, што ўранні дыктатар устаў ракам. Ён пачаў нараду з звычайных пагроз, маўляў, хто прыйшоў проста пасядзець, хай выйдзе н... Ніхто не пайшоў. Аказваецца, нарада была з нагоды чарговай контрэформы школьнай адукацыі. Не спадабалася беларускім верхаводам ідэя 12 гадовай школы. Хоць яны яе весела і шчыра прапагандавалі. Яна, між іншым, нікому не падабалася. І вось на табе: ідэя здохла, так і не вылупіўшыся. Ізноў будуць клычыць дзяцей, школу і настаўнікаў. І так клычаць каторы ўжэ год.

Панове! Такія хаатычныя бязладны дзеянні кажуць адно: Беларуссю кіруюць няўмекі і лайдакі.

## АДНА РУСІФІКАЦЫЯ.

Багата хто думае, што калі ёсьць міністр адукацыі, то ён займаецца адукацыяй. Усе ж вучылі гісторыю старой Грэцыі і ведаюць, што кажын богалімпіец адказваў за свае соткі працы. Апалон за музыку і мастацтва, Афрадыта- за каханне, Арэс- за вайну. і гэтак далей. Але з Беларуссю тут падабенства малое, бо ў нас кажын міністр яшчэ і падміністр. Скажам, міністр паліцыі Навумаў яшчэ выконвае абавязкі міністра хакейнай прамысловасьці. А міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў: якая ў яго нагрузка?

У яго найважнейшая справа не адукацыя, а стварэнне партыі «Белая Русь». Усе свае малыя веды і нікчэмную працу ён аддае партыі. Яму некалі займацца школаю, ВНУ.

Як колісь ў Германіі Язэп Гёбельс камандаваў прапагандай усяго Райху і быў падміністрам адукацыі, так амаль і ў нас.

Мо таму расейскія каланізатары і іхнія памагачкі бабы так расьпеcapазаліся. Яны ўжо забыліся, дзе жывуць і нахабна пруць у беларускія школы ўсё толькі па-расейску. Жаліліся школьнікі, што ўсе тэсты, усе алімпіяды напісаныя толькі і выключна па-расейску. Яны так разапселі, што нават тэсты па беларускай гісторыі напісалі па-руску.

З аднаго боку гэта дэманстрацыя і доказ невуцтва, што пралезла ў адукацыю, а з іншага- поўная зьнявага нас, беларусаў, нашай мовы, нашай культуры, нашай нацыянальнай ідэнтычнасьці.

І справа тут не толькі ў тым, што беларускамоўнае дзіця патрапляе ў горшыя за расейскамоўнае. Справа ў тым, што такім чынам мосьціцца шлях да вынішчэння самой Беларусі, бо без мовы няма народу. А няма народу- няма і краіны.

І калі б толькі адна адукацыя займалася русіфікацыяй. Ніводнае прадпрыемства ў Шацілкаўскім раёне не пазначае сваю прадукцыю па-беларуску. Ні хлебазавод, ні паганы малаказавод з Мядкова.

Дык ці ж не падманны рэферэндум быў у 1995 годзе? Дзе ж тая хоць бы прывідная роўнасьць моў? Рэферэндум заказвалі і выйгралі ў беларусаў нашыя спрадвечныя ворагі- расейскія імперыялісты.

А тутэйшы лёкаі-кухвайкі, олвізы па-нашаму, з скуры вупручуюцца, каб дагадзіць нягоднікам. Гідоцце такая адукацыя.

---

## БЕЛАРУСЬ УРАТАВАНАЯ!!!

Кажын ведае, як наш урад, нашы Палаты і наш дыктатар дбаюць пра дэмаграфічную бясьпеку. Але толькі ў апошняга клопаты не разыходзяцца з справаю: пад час «суботніку» быў выведзены ў «сьвет» і як бы каранаваны на «царства» чатырохгадовы пацан, якога прадставілі, як малодшага сына дыктатара і як бы заказалі для яго наступнае прэзідэнцтва.

Для прэзідэнцтва ён як бы шчэ малаваты, хаця з гісторыі мы ведаем пра прызначэнне каралём непаўналетніх дзяцей. Да іхняга паўналецця ад іх імя правілі рэгенты. Часам такія рэгенты забівалі хлопца і самі рабіліся каралямі.

Чый жа ты, хлопчык?- карціць спытаць. Хто твая мама? Законную жонку дыктатара завуць.... Нуба, ўспомніце! Яе завуць Галіна Радзівонаўна. Мы не чулі пра ейную цяжарнасьць і шчасьлівае раскіданне. Значыцца, Міколкава мама не яна.

Не чулі мы і пра іхні развод і другі шлюб дыктатара, які неяк заявіў, што гора той жанчыне, што пагодзіцца жыць зь ім. (На што ён намякаў? На садамазахізм? На нетрадыцыйную палярызацыю сексуальнай арыентацыі? Ці- бара ні Божа!- на наяўнасьць гарэму, які яму маглі падсунуць шэйхі ў Іране, Саудаўскай Арабіі, ці купіць у складку ў Аб”яднаных Арабскіх Эміратах?)

Прадстаўляючы грамадзтву незаконнанароджанага бастарда дыктатар не толькі выказаў пагарду і зьнявагу маралі, сям”і, сваёй законнай жон-. кі, старэйшых сыноў.

Ён яшчэ выставіў у непрывабным сьвятле малога хлопчыка.

Кажуць, што байструкам нельга заходзіць у царкву, тым болей стаяць перад алтаром. Калі так, то куды пазірае патрыярх -экзарх Хвіларэт? І як жа тады яго вянчаць на царства?

Але не будам плакаць загадзя. Усё ў руцэ Божай. І жыццё і сэрца цара.

А папраўдзе, то гідка. І ці лёгка такое бачыць Галіне Радзівонаўне?

Мы не ведаем, колькі запасных міколкаў-паравозаў ёсьць у дыктатара. І можа здарыцца, што пад гэтую марку зьявіцца некалькі «сапраўдных» малодшых сыноў «прэзідэнта»? І кажын мецьме права на трон. Во калатнеча будзе!!!

Вы яшчэ не зрабілі такога?

## НЯСПРАЎДЖАНЫЯ ЧУТКІ.

По сялу былі пракінуліся чуткі, што да «Дубровы-агры» далучаць калхоз імя Карла Маркса ды Кабульськае калечча. І чуткі мелі пад сабою грунт. Беларускі дыктатар-маляўка неяк заявіў, што кажнае сельгаспрадпрыемства мусіць мець прынамся каля 12.000 гектараў зямлі. (Гэта ў шэсьць разоў болей за княства Манака і амаль роўна плошчы княства Ліхтэнштайн).

Дыктатар занядужаў на гігантаманію. Стварыць вялізныя аграрныя латыфундыі- гэта ягоная мара.

Але ўсім вядома, што невялікія фермерскія гаспадаркі больш эфектыўныя за гігантаў. Да таго ж чым большая латыфундыя, тым болей правоў у гаспадара і тым меней іх у работнікаў, што для грамадзтва нявыгадна.

Гігантаманія захлібнула Беларусь.

Але, кажуць, сп. Зьміцер, тутэйшы дырэктар, адбрыкаўся ад перспектывы быць сельскім касікам. Пакуль што. (А ці хапіла б грошай у Гомельэнерга на такі шыкоўны праект?)

Так што Дуброўскае Агра застаецца ў сваіх ранейшых межах.

А дыктатару трэба падумаць, як пашырыць нацыянальную тэрыторыю ВКЛ, вярнуць у Беларусь нашы спрадвечныя землі, украдзеныя суседзямі: Смаленшчыну, Віленшчыну, Беласточчыну, Чарнігаўшчыну, Заходнюю Браншчыну, каб давесьці кажную аграгаспадарку да памераў княства Ліхтэнштайну.

## ПАГРЭЎ КОСТАЧКІ.

У В"етнам, у далёкі В"етнам павёз дарагі Боінг нашага дыктатара. Тамака ён спадзяваўся і спадзяецца знайсьці эканамічную выгоду.

У В"етнаме ён зрабіў гідкую і абразьлівую для беларусаў заяву: маўляў, для в"етнамскіх гандляроў ствару лепшыя ўмовы, чым для беларусаў. Канешне, беларусы ж не людзі, а вашывыя блыхі.

За такое нізкапаклонства перад чужынцамі Сталін зь яго шкуру зьнізаў бы.

Але куды яму дзецца? У Еўропу не пускаюць, у Амэрыку таксама. От і даводзіцца гойсаць па завуголлю сьвету.

Не мы, беларусы, гаспадары ў сваёй хаце, а дыктатар-чужынец.

## ГАДАВІНА РЭВАЛЮЦЫІ.

33 гады таму , 25 красавіка 1975 году партугальскае войска скінула прафашыстоўскі рэжым у сваёй краіне і ў Партугалію прыйшла дэмакратыя і свабода. Цяперашні беларускі рэжым такі ж фашыстоўскі, як і тагачасны партугальскі. (Беларускі дыктатар заявіў, што ён член камуністычнай партыі, хоць раней маніў, што выйшаў зь яе. І праўда, між фашызмам і камунізмам німа розьніцы).

Хвайны прыклад далі партугальскія ахвіцэры беларускім ахвіцэрам.

## РОГАТУ ВАРТА.

Падаючы інфармацыю пра нараду наконт чарговага крэмзання адукацыі беларускае тэлебачанне падало яе як нейкую палітычную дыскусію. Якая палітычная дыскусія можа быць пры дыктатуры?! Яна выключана па азначэнні.

Проста, праўная хеўра вырашыла чарговым этапам пазьдзекувацца зь дзяцей, з бацькоў, зь беларускай адукацыі, з народу.

Дарма сабе «палітычная» дыскусія! Пра пагром. ішла гамонка .

## ДРАПЕЖНЫ АШЧЭР.

Расея ніколі не вылечыцца ад імперыялізму. Надоечы яна заявіла, што бярэ пад свой юрыдычны кантроль, анексуе, часткі юрыдычна грузінскай тэрыторыі: Паўднёвую Асецію і Абхазію.

Таксама ейныя міністры заяўляюць, што не прызнаюць Украйны. Ну, а Беларусь сама ў расейскую глотку лезе.

Маскалям усё зямлі мала.

Ці не здарыцца, што расейская еўрапейская глотка жрэ тут, а там азіяцкі хвост кітайцы растрыбушаць?

**70** таму , ў 1938 годзе, працягваўся разьвязаны камуністамі і Сталіным вялікі тэрор супраць народу. У Беларусі за год рассстрэльвалі па 30.000 бязьвінных людзей. Былі між іх і дуброўцы.

Немцы за зьдзекі нацыстаў з людзей павініліся, нейкія грошы адкупныя далі. Той жа камуністычны фашызм, што астаўся ў Беларусі, анікаліва не паправіўся. Наадварот, ён гыркае і страшыць, садзіць за краты і курожыць жыццё.

Дарма, здохне! Не даждаў ён!

**Добрае** вядро зь бярозавым сокам укралі ля двара Мішы Сьвятога. Еўдакія бачыла, што там хадзіла баба А., але не надала гэтаму ўвагі. А дарма! Сок зь бярозы ліўся раўчаком, электрыкі адрэзалі лішнюю галіну. Шкада добрага вядра і соку.

Пайшоў ад нас да Госпада добры беларус з Зарэчча
**ШУСТ**
**ІВАН ПЯТРОЎ.**
Хай Гасподзь дасьць яму па веры ягонай. Быў ён вернікам баптыстам.

Друкарня імя І. Масьціцкага. 100 ас.